# Гісторыя

Ю.М. БОХАН

## РЭГІЯНАЛЬНАЯ СПЕЦЫФІКА ЎЗБРАЕННЯ ВОІНАЎ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў XVI ст.

Рассматривается региональная специфика вооружения войска Великого княжества Литовского (ВКЛ) в XVI в. Отмечается, что в ВКЛ существовали четыре основных региона, где преобладали определенные модели вооружения, а также доминировали четыре нормативных вида кавалерии, основными из которых являлись гусарская и казацкая модели.

The regional specific character in the armament of Grand Duchy of Lithuania in the XVI century is being considered in the article. It is noted that there were four main regions in Grand Duchy of Lithuania where specific models.

Першыя спробы рэгулявання ўзбраення воінаў Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) у маштабах усёй дзяржавы былі зроблены даволі позна – у пачатку XVI ст. На Навагрудскім сойме 1502 г. «король его милость Александр с прелаты и паны-радами своими то был установил, иж кождый князь и пан, и дворянин, и земянин мел з именя своего з десяти служоб пахолка у зброи на кони з древцем выправити...»[1]. Падобная ж мадэль узбраення была прапанавана ў 1511 г. Жыгімонтам Старым для Віленскага сойма 1512 г. Такім чынам, у якасці базавай мадэлі паўнавартага вершніка быў выбраны цяжкаўзброены капійнік, забяспечаны «дрэвам» (цяжкім кап'ём тараннага тыпу) і «зброяй» (пласцінавым даспехам). Аднак неабходнасць весці барацьбу на ўсходзе і поўдні, а таксама, верагодна, імкненне павялічыць колькасны склад войска неўзабаве знізілі патрабаванні да ўзбраення і адначасова паменшылі колькасць падданых, з якіх выстаўляўся ўзброены воін. Так, Статут ВКЛ 1529 г. абавязваў усіх уладальнікаў васьмі сялянскіх службаў ставіць «пахолка на добром кони, штобы конь стоял за чоторы копы грошей, а на нём бы панцэр, прилбица а корд, павезка, а древце с прапорцом»[2]. Такім чынам, у канцы трэцяга дзесяцігоддзя XVI ст. адбылася карэкціроўка нарматыўнага ўзбраення за кошт яго аблягчэння. У якасці нарматыўнага быў вызначаны не цяжкі, а аблегчаны капійнічы рыштунак, які неўзабаве атрымаў назву гусарскага па аналогіі з рыштункам славутай венгерскай кавалерыі, якая з'явілася ў ВКЛ у часы Аляксандра Ягелона і аказала значны ўплыў на развіццё вайсковай справы[3].

Тым не менш рэгламентацыя ўзбраення нарматыўнымі актамі не азначала пераходу да яго поўнай уніфікацыі. Так, пасол германскага імператара Сігізмунд Герберштэйн, апісваючы рэаліі першай паловы XVI ст., адзначаў наяўнасць у ліцвінскім войску воінаў, узброеных не толькі кап'ём і шчытом, як венгры, але і лукам, як татары. Ён звяртае ўвагу таксама на пэўныя рэгіянальныя асаблівасці ўзбраення, а менавіта на прыярытэтнае выкарыстанне жамойтамі кароткіх коп'яў (ошчапаў), якія ён параўноўвае з паляўнічымі[4].



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Як сведчаць пісьмовыя крыніцы другой паловы XVI ст., у ВКЛ не толькі існавалі розныя мадэлі ўзбраення кавалерыстаў, але некаторыя з іх нават мелі спецыяльныя акрэсленні. Так, у складзе ліцвінскіх почтаў (атрадаў), якія рушылі з каралём Жыгімонтам 16 ліпеня 1551 г. да Інфлянтаў, ваявода Віленскі выстаўляў 400 гусараў і 200 «бруншвікаў», ваявода Троцкі – 400 гусараў і 250 казакаў і г. д.[5] Падобныя ж катэгорыі воінаў узгадваюцца і ў попісах паспалітага рушэння 1565 і 1567 гг. Апроч таго, тут фіксуецца яшчэ адна катэгорыя, а менавіта «кашубы». Адметнасцю ўзбраення коннікаў, называемых «гусарамі», было спалучэнне шчыта з дрэвам. Асноўнай рысай выдзялення ў асобную катэгорыю воінаў, узброеных «па-казацку», была наяўнасць лука, які мог дапаўняцца кароткай дрэўкавай зброяй у выглядзе рагаціны ці ошчапа.

Відавочна, што мясцовыя карані мела мадэль узбраення «па-кашубску», якая ў якасці асноўнай наступальнай зброі прадугледжвала рагаціну ці ошчап. Цяжэй вызначыць асаблівасці рыштунку рыцарства, узброенага «па-бруншвіцку». У польскай літаратуры існуе меркаванне, што «па-брункшвіцку» ўзбройваліся экіпіраваныя на заходні лад рэйтары ці аркабузеры, забяспечаныя ручной агняпальнай зброяй[6]. Аднак нельга выключыць магчымасці вызначэння тэрмінам «бруншвікі» цяжкіх капійнікаў ці спалучэння ў «нямецкім» рыштунку дрэўкавай зброі з агняпальнай[7].

Як бачна, вышэйназваныя катэгорыі воінаў характарызаваліся асаблівасцямі наступальных сродкаў. Засцерагальнае ўзбраенне, калі і прымалася пад увагу, то мела другараднае значэнне. Кожная катэгорыя вершнікаў магла ўжываць розныя віды аховы тулава – «зброі бляхавыя», панцыры, неметалічныя даспехі ці не ўжываць наогул ніякага баявога пакрыцця цела. Розныя фінансавыя магчымасці феадалаў ВКЛ часам прыводзілі да выстаўлення імі воінаў, якіх цяжка залічыць да якой-небудзь унармаванай катэгорыі, фіксуемай у крыніцах пад асобным тэрмінам. Побач з почтамі, камбатанты якіх выступалі ўзброенымі літаральна з ног да галавы і маглі спалучаць элементы рыштунку розных катэгорый, траплялiся асобы з вельмі скудным асартыментам баявых сродкаў. Апроч таго, сустракаліся выпадкі адсутнасці ў воінаў коней і любой зброі ў поўным сэнсе гэтага слова. Праўда, падобныя выпадкі фіксуюцца ў войску Вялікага Княства не так ужо і часта, аднак яны выдатна ілюструюць каласальную стракатасць ва ўзбраенні вояроў гэтай дзяржавы[8].

У шэрагу выпадкаў анатацыі не дазваляюць скласці дакладнага ўяўлення аб узбраенні камбатантаў. У дачыненні некаторых з іх маецца запіс «збройна», які вызначае характар засцерагальнага ўзбраення не зусім канкрэтна (гэта маглі быць любыя металічныя ахоўныя сродкі, нават адзін шлем), не кажучы ўжо пра зброю далёкага ці блізкага бою, якой магло не быць наогул. Тое ж самае тычыцца фіксавання абстрактнай адзінкі ўліку кавалерыі – «конь», гаспадар якога мог мець хоць нейкае ўзбраенне, але хутчэй за ўсё яго не меў. Такім чынам, нават дадзеныя попісаў трэба разглядаць з улікам магчымых недакладнасцей. Аднак попісы (асабліва найбольш падрабязны попіс 1567 г.) дазваляюць выявіць дастаткова выразную рэгіянальную спецыфіку ўзбраення на тэрыторыі ВКЛ. Яна выявілася ў бытаванні чатырох рэгіёнаў – Жамойці, Падляшша, паўднёвай (Украіна разам з паўднёвабеларускімі паветамі) і цэнтральнай часткі. Для поўдня была характэрнай перавага казацкай мадэлі, лука і шабель, для Жамойці – ошчапаў, часам у спалучэнні з кордамі, тады як у астатніх двух рэгіёнах пэўную перавагу атрымала кашубская мадэль і рагаціна, хаця шырока бытавалі, асабліва ў цэнтральнай частцы, і іншыя. У той жа час на Падляшшы назіраўся надзвычайна вялікі працэнт камбатантаў, узброеных толькі мячамі (радзей – кордамі), прычым у Мельніцкім павеце такія воіны пераважалі.



This document has been edited with Infix PDF Editor
- free for non-commercial use.
To remove this notice, visit:
www.iceni.com/unlock.htm

Дадзеныя попіса 1567 г. праліваюць святло яшчэ на адну асаблівасць паспалітага рушэння ВКЛ – каласальную розніцу ў ступені забяспечанасці зброяй прадстаўнікоў ваеннаабавязанага люду. Побач з магнацкімі атрадамі, выдатна ўзброенымі нават з пункта гледжання перадавых еўрапейскіх армій, шэраговая шляхта (асабліва жамойцкая і падляшская) выглядала дастаткова ўбога, што моцна ўплывала на характар узброеных сіл у цэлым. Гэта, а не нібыта ўсходні характар літоўскага войска, у значнай ступені тлумачыць досыць скептычныя адносіны да яго матэрыяльна-тэхнічнага стану спачатку з боку рыцараў Тэўтонскага ордэна, а пасля і з боку палякаў.

[1] Документы Московского архива Министерства юстиции. М., 1897. Т. 1. С. 507.
[2] Zbior praw litewskich od roku 1389 do roku 1529. Tudzez rozprawy sejmowe o tychze prawach od roku 1544 do roku 1563. Poznań, 1841. S. 170.
[3] См.: Бохан Ю.М. Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV – канца XVI ст. Мн., 2002. С. 247–249.
[4] См.: Герберштейн С. Записки о Московии. М., 1988. С. 187, 195.
[5] См.: Gorski K. Historya jazdy polskiej. 2-e wyd. Krakow, 1895. S. 304.
[6] См.: Zygulski Zd. Bron w dawnej Polsce na tle uzbrojenia Europy i Bliskiego Wschodu. 2-e wyd. Warszawa, 1982. S. 183.
[7] См.: Бохан Ю.М. Указ. тв. С. 253–256.
[8] См.: Русская историческая библиотека. Пг., 1915. Т. 33. Ст. 537–1354.

Паступіў у рэдакцыю 26.03.2003.

*Юрый Мікалаевіч Бохан* – кандыдат гістарычных навук, загадчык аддзела гісторыі Беларусі XIII–XVIII ст. Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

*А.А. КИСЕЛЕВ*

## ИЗМЕНЕНИЯ В СИСТЕМЕ УПРАВЛЕНИЯ БЕЛОРУССКИМИ ГУБЕРНИЯМИ И СОСТАВ БЮРОКРАТИЧЕСКОГО АППАРАТА В ПЕРВОЙ ЧЕТВЕРТИ XIX в.

Рассматривается внутренняя политика российского правительства в системе местного управления белорусскими губерниями в первой четверти XIX в. В ней приводятся сведения о социальном происхождении, имущественном положении, образовании, месте рождения и чинах основных чиновников губернской и уездной администрации белорусских губерний.

The article is devoted to the internal policy of the Russian government in the system of administration of the Belaruslan provinces in the first quarter of the nineteenth century. The data of social origin, property status, education, birthplace and ranks of the basic provincial officials and district administration of Belarusian provinces are presented.

В белорусских губерниях в первой четверти XIX в. почти полностью была сохранена система управления, сложившаяся при Павле I. За годы правления Александра I в ней произошли, однако, некоторые изменения, позволяющие выделить это время в отдельный период внутренней политики самодержавия. Направленность административных преобразований в первую очередь определялась взглядами Александра I – противника разделов Речи Посполитой – на положение западных губерний в составе империи. Еще будучи наследником престола, Александр I в своих беседах с князем А. Чарторыйским признавался, что «его симпатии были на стороне Польши и ее славной борьбы, что он оплакивал ее падение»[1]. Несмотря на обещание при вступлении на трон следовать заветам Екатерины II, император не отменил преобразований Павла I в западных губерниях и фактически подтвердил их особый статус в империи[2]. Однако он не торопился осуществлять какие-либо проекты реставрации польской государственности. Князь Чарторыйский в своих воспоминаниях не случайно писал, что внутренняя политика Александра I в начале царствования не соответствовала его обещаниям, данным «в годы юности»[3], поскольку он видел решение польского вопроса «лишь в далеком будущем» и «не считал необходимым серьезно вникать в него»[4]. Император, в



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm